

1



2

*Да арт.* ***Аматарскае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва****: 1 — Ю.А д а м о в і ч. Пано «Лось». 1997; 2 — М.Ч а р н а в о к а я. Дыван «Сустрэча». 1998.*

граматычнай катэгоры. Прыкладам выкарыстання А. з'яўляецца верш Я.Купалы «У купальскую ноч»: «Цемра з нетрай **скача скокі**...», «Так шукае, **лазіць лазам**...», «Кветкі **пільна** я **пільную**», «На **замкоў замкнёна** сорак...».

**АМАНІМІ́ЧНАЯ РЫ́ФМА**, рыфма, у якой спалучаюцца словы-амонімы. А.р. часта сустракаецца ў фальклоры. Выкарыстаная ў вершы, яна стварае своеасаблівы маст. каларыт, дазваляе выявіць глыбокае веданне паэтам роднай мовы, дасканалае валоданне ім паэт. тэхнікай.

Спытаўся бог у грэшніка:  
— Чаму шмат піў *віна*?  
У гэтым, — кажа, — не мая *віна*.  
Сам знаеш, з гліны ты мяне стварыў,  
І каб мне не рассыпацца — я піў.  
(М.Танк. «Перайманне Умара Хаяма»)

*В.П.Рагойша.*

**АМАРАЛІ́ЗМ** (ад грэч. а... адмаўленне + лац. moralis маральны), адмаўленне універсальнай маралі; адсутнасць уяўленняў пра дабро і зло і пра існаванне маральных норм. У свядомасці і паводзінах людзей А. можа спараджацца сац. прычынамі і больш пашыраецца ў перыяды сац. крызісаў. Паводле франц. філосафа А.Бергсана, тых, каго пры жыцці абвінавачвалі ў нешанаванні «дзяржаўных» каштоўнасцей (напр., Сакрата, Ісуса Хрыста), пазней прызнавалі найвялікшымі маралістамі чалавецтва; Ф.Ніцшэ разглядаў А. як стан выдатнай творчай асобы. Аднак часцей пад А. разумеюць ігнараванне агульнапрынятых норм паводзін, абвяшчэнне антымаральных паводзін «маральнымі». Да праяўленняў А. можна аднесці *цынізм*, крайні *нігілізм*, адкрыты *эгаізм*, чалавеканенавісніцтва.

*В.Р.Языковіч.*

**АМА́ТАРСКАЕ ВЫЯЎЛЕ́НЧАЕ І ДЭКАРАТЫ́ЎНА-ПРЫКЛАДНО́Е МАСТА́ЦТВА**, самадзейная творчасць у галіне жывапісу, скульптуры,

*Да арт.* ***Аматарскае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва****. Пленэр манументальнай скульптуры на тэрыторыі комплексу Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі. 2003.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ